Установа адукацыі
―Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА”Беларускі дзяржаўны
універсітэт культуры і мастацтваў”
__________________Ю.П.Бондар
―___” _____________2012г.
Рэгістрацыйны № ВД ______ /баз

***ІНСТРУМЕНТАЛЬНЫ АНСАМБЛЬ СТАРАДАЎНЯЙ МУЗЫКІ***

*Вучэбная праграма па спецыяльнасці 1-18 01 01*

*народная творчасць (па напрамках)*

*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-02*

*народная творчасць (інструментальная музыка)*

*спецыялізацыя 1-18 01 01-02 01*

*інструментальная музыка народная*

Мінск 2012

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**_Складальник_**

*Сухаварава Л.А.,* дацэнт кафедры народна-інструментальнай творчасці ўстановы адукацыі ―Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў*”*

**_Рэцэнзенты_**

*С.А.Руткевич,* кандидат искусствоведения, старший преподаватель кафедры культурологии и психолого-педагагических дисциплин ГУО ―Институт культуры Беларуси”;

*Карацееў А.Л,* кандыдат мастацтвазнаўства, кафедры кафедры духавой музыкі ўстановы адукацыі ―Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў*”.*

**_Рэкамендавана да зацвярджэння_**

*кафедрай народна-инструментальнай творчасци ўстановы адукацыі ―Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”* " (пратакол №1 ад 31.08.2012 г.);

*прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі ―Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”* (пратакол № __ ад __.__.2012 г.);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю
Адказны за выпуск Л.А.Сухаварава

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Прадмет ***«Інструментальны ансамбль старадаўняй музыкі»*** гэта прадмент, які дае магчымасць пазнаеміць студэнтаў з найлепшымі ўзорамі нацыянальнай скарбонкі, дачыніцца да вытокаў музычнай культуры Заходняй Еўропы і іншых дзяржаў. Ен ўваходзіць у цыкл прафілюючых дысцыплін кафедры народна-інструментальнай творчасці Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў.

У сувязі з патрабаваннямі сучаснай сістэмы адукацыі аб паляпшэнні прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў, студэнтаў творчых навучальных установ, рашаючую ролю набываюць дысцыпліны, якія фарміруюць у студэнта веды, навыкі і ўменні, неабходныя для яго будучай творчай і педагагічнай дзейнасці.

Гэтым працэсам падрыхтоўкі так сама займаецца и дысцыпліна *«Інструментальны ансамбль старадаўняй музыкі»* ***асноўная мэта*** якой – развіцце творчых здольнасцей асобы на падставе стварэння ўласных інструментовак, аранжыровак і пералаженняў для ансамбляў розных складаў. Выхаванне ў студэнта ідэйна-эстэтычнай пазіцыі, паважанасці і любві да нацыянальнага мастацтва, развіццё і замацаванне яго педагагічнай эрудыцыі і глыбокіх ведаў ансамблевага музычна-выканальніцкага мастацтва на сучасным этапе.

***Асноўнымі задачамі*** курса з’яўляюцца:

- далучэнне студэнтаў да лепшых крыніц нацыянальнай і сусветнай музычнай спадчыны;
- набыццё студэнтам практычнага вопыту ігры ў ансамблі і работы з калектывам;
- авалодванне этапамі і метадамі рэпетыцыйнай работы з ансамблем;
- уменне на аснове ўважлівага і ўдумлівага вывучэння нотнага тэксту стварыць і рэалізаваць мастацкі вобраз музычнага твору;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- фарміраванне навыкаў работы калектыва над рознымі выканальніцкімі складанасцямі;

- развіццё ў студэнта здольнасці да абагульнення набытых ведаў і ўмення выкарыстоўваць іх у далейшай рабоце.

У працэсе навучання студэнты атрымліваюць прафесійныя ***веды і ўменні*** па наступных пытаннях:

- эмацыянальна-псіхалагічныя асаблівасці ігры ў творчым калектыве;

- псіхолага-педагагічныя ўмовы арганізацыі інструментальнага ансамбля старадаўняй музыкі;

- этапы работы над музычным творам у інструментальным ансамблі ;

- работа з ансамблем над гукавай перспектывай, тэмбравай палітрай твора, сінхроннасцю гучання;

- стварэнне і асблівасці драматургіі музычнага твора ў калектыўнай творчасці;

- асаблівасці складання рэпертуару для інструментальных ансамбляў старадаўняй музыкі розных складаў.

***Асноўныя формы навучання*** ў класе інструментальнага ансамбля:

- заняткі ў форме рэпетыцый, якія праводзяцца выкладчыкам, кіраўніком ансамбля;

- самастойныя заняткі, якія праводзіць студэнт аўтар інструментоўкі ў прысутнасці выкладчыка;

- самастойныя заняткі студэнта па вывучэнню партытуры твора;

- канцэртнае выкананне праграмы на кантрольных уроках, заліках і экзаменах.

Паспяховасць навучання ў класе інструментальнага ансамбля залежыць ад суадносін паміж формамі навучання, такімі як:

- індывідуальная работа над партыямі: дэталёвая работа над штрыхамі, артыкуляцыяй, падборам аплікатуры, выканальніцкімі прыёмамі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- рэпетыцыі пад кіраўніцтвам выкладчыка: работа над сінхроннасцю гучання, тэмпамі, агогікай, гукавай перспектывай і тэмбравым балансам, формай і зместам твора;

- канцэртнае выступленне: прывіццё студэнтам навыкаў артыстызму, сцэнічных паводзін, умення даносіць галоўную мэту твора да слухачоў.

***Мэты рэпетыцыйных заняткаў*** – далейшае развіццё музычных і выканальніцкіх здольнасцей студэнтаў, вывучэнне сучасных тэхналогій пры вызначэнні сродкаў тэхнічнай дасканаласці і мастацкай выразнасці кожнага ўдзельніка калектыву, вызначэнне пытанняў для далейшай самастойнай работы студэнтаў над партыямі і партытурай.

Планаванне выкладчыкам вучэбнай работы с калектывам і глыбока прадуманы выбар рэпертуару з’яўляюцца найважнейшымі фактарамі спрыяючымі правільнай арганізацыі вучэбнага працэсу і ўсебаковаму развіццю прафесійных здольнасцей студэнтаў.

У рэпертуар трэба ўключаць лепшыя ўзоры твораў старадаўняй класічнай і камернай музыкі, творы буйных форм, шырока прапагандаваць творы нацыянальнай музычнай спадчыны.

Курс навучання ў класе інструментальнага ансамбля старадаўняй музыкі, у адпаведнасці з вучэбным планам, разлічаны на чатыры семестры на працягу IV і V курсаў.

***Асноўныя формы атэстацыі*** студэнтаў – кантрольны ўрок, залік ці экзамен.

У канцы кожнага семестра прадугледжаны кантрольны ўрок, экзамен альбо залік, на якіх выконваюцца праграмы з інструментовак студэнтаў, падрыхтаваных пад кіраўніцтвам выкладчыка па інструментоўцы і агучаных у ансамблі.

У VII семестры IV курса (форма атэстацыі - залік) кожны студэнт рыхтуе да выканання ў ансамблі два творы:

- адзін твор старадаўняй музыкі XVI – XVII стагоддзяў,

- другі твор з ранейшага рэпертуару ансамбля.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У канцы IV курса рыхтуюцца да выканання два новых творы, адзін з іх абавязкова твор беларускай музычнай спадчыны.

У IX семестры V курса кожны студэнт прадстаўляе праграму з трох твораў, з абавязковым ўключэннем старадаўняй музыкі XVII – XVIII стагоддзяў і беларускага твору з ранейшага рэпертуару ансамбля.

На працягу X семестра (форма атэстацыі - экзамен) рыхтуецца праграма, якая складаецца з чатырох твораў розных стылявых накірункаў старадаўняй музыкі. Абавязкова ўключаецца твор беларускай музыкі.

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | Колькасць аўд. (дробнагруп.) гадзін |
|---|---|
| *Тэма 1*. Псіхолага-педагагічныя ўмовы арганізацыі інструментальнага ансамбля старадаўняй музыкі | 6 |
| *Тэма 2*. Жанрава-стылістычныя асаблівасці выканання музычных твораў у ансамблі | 8 |
| *Тэма 3*. Старадаўняя музыка Заходняй Еўропы | 10 |
| *Тэма 4*. Венская класічная школа | 8 |
| *Тэма 5*. Старадаўняя музыка Расіі і Украіны | 8 |
| *Тэма 6*. Старадаўняя музыка Беларусі | 10 |
| *Тэма 7*. Асноўныя этапы работы над музычным творам — | 8 |
| *Тэма 8*. Дынаміка як сродак музычнай выразнасці, баланс гучання паміж партыямі | 8 |
| *Тэма 9*. Гукавая перспектыва музычных твораў у ансамблевым выкананні. | 8 |
| *Тэма 10*. Фразіроўка ў працэсе выканання, артыкуляцыя і штрыхі. | 8 |
| *Тэма 11*. Асаблівасці ансамблевай тэхнікі | 8 |
| *Тэма 12* Візуальны кантакт у ансамблевым выканаўстве. | 8 |
| *Тэма 12*. Асновы канцэртнай дзейнасці, самарэгуляванне эмацыянальнага стану пад час канцэртных выступленняў | 6 |
| *Тэма 13*.Стварэнне вучэбнага і канцэртнага рэпертуару | 6 |
| **Усяго**… | **110** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛИНЫ

### Тэма 1. Псіхолага-педагагічныя ўмовы арганізацыі інструментальнага ансамбля старадаўняй музыкі

Інструментальны ансамбль як творчая лабараторыя, дзе студэнт набывае ўменне і навыкі неабходныя для далейшай паспяховай работы ў якасці ўдзельніка ансамбля і яго кіраўніка. Асамбль – форма калектыўнай творчасці, якая стварае сваеасаблівы псіхалагічны клімат, фарміруе характар, волю, агульныя інтарэсы яго ўдзельнікаў. Узаемаразуменне, згода, самакрытычнасць, імкнення да самаўдасканалення, як аснова для стварэння творчай атмасферы ў ансамблі. Уплый працаздольнасці, сумленнасці, адпаведнага ўзровеню прафесійнай падрыхтоўкі ўдзельнікаў ансамбля на паспяховасць сумеснай працы, на стварэнне у калектыве псіхалагічнага клімату, які спрыяе далейшаму росту прафесійнага майстэрства.

### Тэма 2. Жанрава-стылістычныя асаблівасці выканання музычных твораў у ансамблі

Паняцце стылю і жанру. Стылі розных эпох, мастацкі стыль, выканальніцкі стыль, кампазітарскі стыль. Ўплыў эпохі і стану музычных школ на развіццё стылю. Прынцыпы падыходу да выяўлення стылістычных асаблівасцей музычнага твора. Асаблівасці выканальніцкага стылю. Асаблівасці кампазітарскіх стыляў. Эвалюцыя ансамблевых і аркестравых стылей. Асаблівасці народна-інструментальнага музіцыравання. Ансамблі старадаўняй музыкі Ансамблі народных інструментаў і нацыянальные традыцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 3. Старадаўняя музыка Заходняй Еўропы

Стварэння рэпертуару ансамбля старадаўняй музыкі на аснове старадаўняй музыкі кампазітараў Заходняй Еўропы. Творчасць італьянскага кампазітара Дж.Фрэскабальдзі (развіцце тэхнікі тэматычных варыяцый, афармленне цыклічнасці). Творы для камернага аркестра А.Вівальдзі і А.Карэллі. Творчасць французскіх кампазітараў-клавісіністаў Ф.Куперэна, Л.К.Дакэна, Ж.К.Рамо (гібкая рытміка, меладычнае багацце, грацыезнасць). Творчасць англійскага кампазітара Г.Ф.Гендэля (класічныя сюіты, старадаўнія танцы). Творы выдатнага нямецкага паліфаніста І.С.Баха.

## Тэма 4. Венская класічная школа

Творчасць кампазітараў Венскай класічнай школы як вершыня сусветнай мастацкай культуры.

Творчасць Й.Гайдна, В.А.Моцарта і Л.В.Бетховена. Характэрныя рысы кампазітараў Венскай класічнай школы (універсальнасць мышлення, лагічнасць і яснасць мастацкай формы).

## Тэма 5. Старадаўняя музыка Расіі і Украіны

Старадаўняя музыка Расіі ў творах Д.Бартнянскага (творы для камерна-інструментальных анмблей, канцертня сімфонія, струнные квінтэты, духоўная музыка, санаты, творы для клавіра). Творчасць І.Хандошкіна (выкарыстоўванне новых метадаў вар'іравання народных песен і сказаў, яркасць і выразнасць тэматычнага матэрыялу інструментальнай музыкі, выкарыстанне мелодый рускіх былін).

Украінская старадаўняя музыка. Канты, думкі, балады. Творы духоўнай і камерна-інструментальнай музыки ў творчасци Э.Ванжура, І.М.Віткоўскага, А.І.Лізагубава.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 6. Старадаўняя музыка Беларусі.

Вывучэнне скарбонкі беларускай спадчыны праз творчасць вядомых кампазітараў мінулага. Паланезы, серенада і дывертысмент для струнных інструментаў Маццея Раддзівіла, мазуркі, паланезы, менуэты, вальсы Міхала Клеофаса Агінскага. Творы для інструментальнага ансамбля Міхала Казімежа Агінскага і Ніколы Дзілецкага. Творы для камерных ансамбляў Восіпа Казлоўскага, Антона Абрамовіча, Напалеона Орды, Юзефа Ігнацiя і Каятана Крашэўскіх – аснова рэпертуарнага спісу ансамбля старадаўняй музыкі любога складу.

## Тэма 7. Асноўныя этапы работы над музычным творам

Работа над музычным творам мае наступныя этапы:

*Першы этап.* Знаёмства з творам, эпохай, стылем, характэрнымі рысамі і асаблівасцямі творчасці кампазітара. Стварэнне мадэлі твора ў адпаведнасці з задумкай кампазітара. Эскізнае прайграванне тэксту з мэтай цэласнага ўяўлення характара і музычных вобразаў дадзенага твору.

*Другі этап.* Праца над тэкстам сваёй партыі. Вывучэнне інтанацыйнага сэнсу фраз, сказаў, іх асэнсаванне ў кантэксце ўсёй партытуры. Вырашэнне пытанняў найбольш зручнай аплікатуры, вызначэнне сродкаў пераадольвання выканальніцкіх складанасцей. Прыемы гукаўтварэння, сінхроннасць выканання агогікі, артыкуляцыі і метрарытму.

*Трэці этап*. Сінтэз усіх дэталяў зместу твора. Ўдасканаленне твора пад час рэпетыцый. Пошук трактоўкі, асенсаванне формы, замацаванне пытанняў тэмпу, метрарытму, вызначэнне прыватный і агульнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кульмінацыі, агогіка і іншыя сродкі музычнай выразнасці. Прастаўленне рэгістраў ў акардэонаў і баянаў

### Тэма 8. Дынаміка як сродак музычнай выразнасці, баланс гучання паміж партыямі

Дынаміка як адзін з асноўных сродкаў музычнай выразнасці. Раскрыцце з дапамогай дынамікі асаблівасцей стылю, асенсаване агульнага характару музыкі, разуменне яе эмацыянальнага складу, асаблівасцей формы твора. Правільнасць падабранага дынамічнага плана як аснова выразнасці гукаўтварэння і артыкуляцыі, дапамага лепшаму раскрыццю музычных вобразаў. Дакладае разуменне ўдзельнікамі ансамбля функцыянальнай ролі выконваемых галасоў (мелодыя, падгалосак, гарманічнае суправаджэнне, кантрапункт, бас) у спалучэнні са слыхавым кантролем як сродак да дасягнення правільных дынамічных суадносін галасоў.. Вызначэнне галоўнаага ў агульным гучанні як магчымасць яркага, рэльефнага і выразнага выканання.

### Тэма 9. Гукавая перспектыва музычных твораў у ансамблевым выкананн

Разгляд музычнай фактуры па гарызанталі (мелодыя) і па вертыкалі (гармонія). Стварэнне гарызантальнай або вертыкальнай гукавай перспектывы. Перспектыва размяркавання галасоў па насычанасці іх гучання. Дасягненне дэферэнцыяцыі гучання пры дапамозе размяркавання галасоў па ступені іх дынамічнай выразнасці. Шматпланавасць музыкі ў суадносінах гучання партытуры па гарызанталі і па вертыкалі. Асэнсаванне гэтых суадносін у працэсе работы над музычным творам і замацаванне пад час рэпетыцый ўсемі ўдзельнікамі ансамбля.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 10. Фразіроўка ў працэсе выканання, артыкуляцыя і штрыхі

Фразіроўка ў працэсе выканання твора ў ансамблі як адзін з асноўных выразных элементаў ансамблевай фактуры. Ўплыў фразіроўкі на структуру пабудовы мелодыі, змяненне дынамікі, на дынамічную форму твора, выяўленне лакальнай і агульнай кульмінацый.

Адзінства ў выкананні штрыхоў і артыкуляцыі ўсемі ўдзельнікамі ансамбля як важнейшы крытэрый прафесійнага выканання твора. Артыкуляцыя як мастацтва вымаўлення музыкі з розным характарам гукавай атакі. Артыкуляцыя ідэнтычная і кантрастная. Штрыхі, як сродак музычнай выразнасцідля адлюстравання характара гучання твору. Асноўныя віды штрыхоў: легатісіма, легата, нон легата, стаката, марката і іншыя.

## Тэма 11. Асаблівасці ансамблевай тэхнікі

Паглыбленая работа над творам для паразумення вобразнага зместу выконваемага твору. Удасканаленне ансамблевай тэхнікі. Ідэнтыфікацыя артыкуляцыі і штрыхоў, паляпшенне тэхнікі іх выканання, узмацненне сінхроннасці метрарытму, тэмпу і агогікі, асэнсоўванне дынамічнага і тэмбравага балансу. Аб'яднанне ваканальніцкіх манер усіх ўдзельнікаў ансамбля пры захаванні істотных рыс кожнага студента. Дасягненне ўмення адзінай перадачы ўсіх асаблівасцей зместу нотнага тэксту. Авалоданне калектывам выдатнай ансамблевай тэхнікай як магчымасць пры выкананні твора здзейсніць свой гукавы, эмацыянальна-вобразны і творчы намер.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 12. Візуальны кантакт у ансамблевам выканальніцтве

Дасягненне ансамблевага адзінства дзякуючы візуальнаму кантакту паміж выканаўцамі. Сувязь дырыжора з аркестрам з дапамогай мануальнай тэхнікі, позірку, мімікай, рухам галавы ці корпуса. Частковае выкарыстанне гэтых фактараў удзельнікамі ансамбля. Неабходнась аўфтакта ў тэмпе гучання твора перад пачаткам выканання. Выкарыстанне гэтага прыему пры заканчэнні твора. Неабходнасць візуальнага кантакту як асноўная абумоўленасць паспяховага выканання музычных твораў. Асаблівасці візуальнага кантакту пры выкананні акампанементу салістам як сродак стварэння дыялогаў, якія патрабуюць адхіленняў ад асноўнага тэмпу, цэзур і шмат другіх выканальніцкіх прыёмаў.

## Тэма 13. Асновы канцэртнай дзейнасці.

Сувязь выканальніцкаі дзейнасці музыкантаў з разумовай і нервова-эмацыянальнай нагрузкай. Самакантроль за каардынацыяй ігравых рухаў, слыху, мыслення, сцэнічных паводзін перад выхадам на сцэну і пад час выступлення. Хваляванне, трывога і страх як перашкоды для асэнсаванага і выразнага выканання

Існуюць асноўныя псіхалагічныя якасці, якія неабходна выхоўваць у сабе музыканту для паспяховых канцэртных выступленняў:

- выдатнае валоданне тэкстам выконваемых твораў;
- эмацыянальная накіраванасць на раскрыццё музычных вобразаў;
- засяроджанасць увагі;
- упэўненасць у сваіх выканальніцкіх здольнасцях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма14. Стварэнне вучэбнага і канцэртнага рэпертуару

Рэпертуар як аснова паспяховай канцэртнай дзейнасці любога калектыва. Роля вучэбнага рэпертуару ў выхаванні эстэтычнага густу студэнтаў. Творы розных стыляў і жанраў, лепшыя ўзоры міравой, старадаўняй і класічнай музыкі, старадаўнія і сучасныя творы беларускіх кампазітараў у вучэбным рэпертуары. Творы для ансамбляў рознага тэмбравага складу як захавальнікі свайго спецыфічнага рэпертуару. Роля кіраўніка ў паслядоўнасці складаняі вучэбнага рэпертуару і перспектыўных планаў па стварэнні канцэртнага рэпертуару. Канцэртны рэпертуар як сродак які спрыяе творчаму росту удзельнікаў, узмацняе іх інтарэс да калектыўнага музіцыравання, выхавання пачуцця адказнасці перад другімі ўдзельнікамі ансамбля пад час канцэртных выступленняў.

### ЛІТАРАТУРА

***Асноўная***


1. *Агінскі М.Кл.* Творы для камерных ансамбляў: Нотнае выданне. – Мінск.:БелІПК,1997.- 88 с.
2. *Агінскі М.К.* Шэсць п'ес з вакальнага цыкла ―Да Касі" для інструментальнага ансамбля: Нотнае выданне – Мінск.:БелІПК,1998. - 32 с.
3. *Беларуская* музыка XVI – XVII стст. Вучэб –метад. рэкам. для ігры ў ансамблі / Склад. Л.П. Касцюкавец. – Мінск.: БГК, 1990. – 37 с.
4. *Бэлза И.* М. Кл. Огиньский. - М.: Музыка, 1974. – 85 с.
5. *Гладков Е.* Совершенствование приемов звукоизвлечения и артикуляции при игре на белорусских цимбалах. – Мн.: Беларусь, 1976. - 95 с.
6. *Дробов Л.* Наполеон Орда – художник и собиратель. — Памятники истории и культуры Белоруссии, 1971, № 3.
7. *Жывалеўскі В.* Лютня *і гітара на беларускіх землях. // Пытанні культуры і мастацтва Беларусі. – Мінск, 1991. – Вып 10. – С.20-23.*
8. *Имханицкий М.* История исполнительства на русских народных инструментах. – М.: Изд-во РАМ им. Гнесиных, *2002. – 351 с.*
9. *Казлоўскі Восіп*. Творы для камерных ансамбляў: Нотнае выданне.– Мінск.: БелІПК,1998. – 24 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

10. *Каргин А.* Работа с самодеятельным оркестром русских народных инструментов. – М.: Музыка, 1982. - 159 с.
11. *Клебанов Д.* Искусство инструментовки. - Киев: Музична Украіна, 1972. – 219 с.
12. *Ливанова Т.Н.* Западно-европейская музыка XVII - XVIII веков в ряду искусств. – М.: Музыка, 1977. 162 с.
13. Мицуль М. Артикуляция на белорусских цимбалах. – Мн.: МИК, 1985. – 15 с.
14. Мицуль Н. Белорусские цимбалы в контексте мировой музыкальной культуры. – Минск: Бел. гос. ун-т культуры и искусств, 2006. – 118 с.
15. *Ризоль Н.* Очерки о работе в ансамбле баянистов. – М.: Сов. композитор, 1986. – 225 с.
16. *Рыцарева М.* Композитор Д.Бортнянский. Жизнь и творчество. – Л.: Сов. композитор, 1979. – 125 с.
17. Скорабагатчанка А. Народная інструментальная культура Беларускага Паазер'я. – Мінск: Бел.навука, 1997. – 471 с.: нот., іл.
18. *Тихонов В.* Основы методики музыкальных занятий в самодеятельном оркестре народных инструментов. - М.: Музыка, 1978. – 115 с.
19. *Фесечко Г.* И.Е.Хандошкин. – Л.: Сов. композитор, 1972. – 112 с.
20. *Шнеерсон Г.* Музыка Франции. – М.: Сов. композитор, 1958. – 176 с.
21. *Яканюк Н.* Да пытання перыядызацыі народна-інструментальнай музычнай культуры Беларусі // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры, 2002. - №1. – С. 54-56.

***Дадатковая***

1. *Асафьев Б.* Музыкальная форма как процесс. 2-е. – Л.: Музыка, 1971. – 350 с.
2. *Банин А.* Русская инструментальная музыка фольклорной традиции. – М.: Музыка, 1997. – 125 с.
3. *Баренбойм Л.* Музыкальная педагогика и исполнительство. – Л.: Музыка, 1974. – 335 с.
4. *Браудо И.* Артикуляция. – М.: Музыка, 1973. - 195 с.
5. *Гинзбург Л.* Избранное. – М : Сов. композитор, 1981. – 301 с.
6. *Ержемский Г.* Психология дирижирования: Некоторые вопросы исполнительства и творческого взаимодействия дирижера с музыкальным коллективом. – М.: Музыка, 1984.– 79 с.
7. *Имханицкий М.* У истоков русской народной оркестровой культуры. М.: Музыка, 1987, - 143 с.
8. *Имханицкий М.* Новое об артикуляции и штрихах на баяне. – М.: Изд-во РАМ им. Гнесиных, 1997. – 44 с.
9. *Корыхалова Н.* Интерпретация музыки. – Л.: Сов. композитор, 1979. – 186 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

10. *Кременштейн Б.* Педагогика Г.Г. Нейгауза. – М.: Музыка, 1984. – 64 с.
11. *Кузьмініч М., Яканюк Н.* Інструментазнаўства і інструментоўка для аркестраў і ансамбляў беларускіх народных інструментаў. – Мн.: БДУкультуры, 2001. – 203 с.
12. *Липс Ф.* Искусство игры на баяне. – М.: Музыка, 1982. - 160 с.
13. *Мазанік В.* Актывізацыя музычнага слыху ў рабоце над партытурай. – Мн.: БДУкультуры, 1996. – 11 с.
14. *Максимов Е.* Оркестры и ансамбли русских народных инструментов. – М.: Сов. композитор, 1983. – 137 с.
15. *Максимов Е.* Ансамбли и оркестры гармоник: пособие для руководителей самодеятельных коллективов. – М.: Сов. композитор, 1979. – 176 с.
16. *Методика* обучения игре на народных инструментах. / Сост. П. Говорушко. – Л.: Музыка, 1975. – 32 с.
17. *Мирек А.* Гармоника. Прошлое и настоящее. – М.: Музыка, 1994. – 225 с.
18. *Мирек А.* Из истории аккордеона и баяна. – М : Музыка, 1967. – 307 с.
19. *Паньков О.* О работе баяниста над ритмом. – М.: Музыка, 1986. – 62 с.
20. *Пистон У.* Оркестровка. – М.: Сов. композитор, 1990. – 464 с.
21. *Прошко Н.* Методические рекомендации для оркестров и ансамблей народных инструментов. - Мн : БГК, 1972. – 15 с.
22. *Пузыня Ул.* Лірнік: школа ігры на беларускіх народных інструментах. – Мн.: Бел. ін-т праблем культуры, 1993. – 140 с.
23. *Розанов В.* Инструментоведение: пособие для руководителей оркестров русских народных инструменто. - М.: Сов. композитор, 1974. – 135 с.
24. *Розанов В.* Русские народные инструментальные ансамбли. – М.: Музыка, 1972. – 120 с.
25. *Теплов Б.* Психология музыкальных способностей. Избранные труды. В.2-х т. Т.1. – М.: Музыка, 1985. – 230 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

***ІНСТРУМЕНТАЛЬНЫ АНСАМБЛЬ СТАРАДАЎНЯЙ МУЗЫКІ***

*Вучэбная праграма па спецыяльнасці 1-18 01 01*
*народная творчасць (па напрамках)*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-02*
*народная творчасць (інструментальная музыка)*
*спецыялізацыя 1-18 01 01-02 01*
*інструментальная музыка народная*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ